# Раздзел 1
# Краязнаўства як кірунак дзейнасці бібліятэк

**Кузьмініч Т.В.** (Мінск)

## БІБЛІЯТЭЧНАЕ КРАЯЗНАЎСТВА Ў КАНТЭКСЦЕ СТВАРЭННЯ РЭСУРСАЎ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯГРАФІІ БЕЛАРУСІ І НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ЭЛЕКТРОННАЙ БІБЛІЯТЭКІ

*Разглядаюцца арганізацыйныя, метадычныя і тэхналагічныя аспекты стварэння краязнаўчых рэсурсаў беларускімі бібліятэкамі на сучасным этапе, а таксама неабходныя ўмовы для перспектыў іх інтэграцыі на другасна дакументным і паўнатэкставым узроўнях ў электронны інфармацыйны рэсурс нацыянальнай бібліяграфіі Беларусі і нацыянальную электронную бібліятэку Беларусі.*

Кардынальныя змены, якія адбываюцца ў камунікатыўных працэсах грамадства ў цэлым, выдавецкай і кнігагандлёвай справах у прыватнасці, значна ўплываюць і на кірункі дзейнасці сучасных бібліятэк: найбольш запатрабаванымі і прэстыжнымі (рэйтынгавымі) становіцца кумуляванне нацыянальнай дакументнай прадукцыі і стварэнне інфармацыйных рэсурсаў краіназнаўчага і краязнаўчага характару. Гэта магчымасць замацаваць за бібліятэкай як сацыяльным інстытутам збор, захаванне і разнастайную інфармацыйную апрацоўку нацыянальных фіксаваных тэкстаў, а таксама сусветных патокаў інфармацыі, якія маюць дачыненне да айчыны, яе пэўнага рэгіёна, тэрыторыі, нацыі, народа, і рабіць свой выключна важны ўнёсак у справу захавання гісторыка-культурнай памяці грамадства. Пры гэтым бібліятэкі розных узроўняў павінны кансалідаваць свае намаганні, што патрабуе ў некаторых выпадках не проста скарэктаваць асобныя кірункі дзейнасці, а, магчыма, карэнным чынам змяніць іх.

У дадзеным артыкуле разглядаюцца некаторыя арганізацыйныя, метадычныя і тэхналагічныя аспекты існавання і развіцця сучасных краязнаўчых рэсурсаў як неад’емнай складаючай самых буйных для айчыннай бібліятэчнай справы праектаў – стварэнне

электроннага інфармацыйнага рэсурсу нацыянальнай бібліяграфіі Беларусі і нацыянальнай электроннай бібліятэкі Беларусі.

На алгарытмы збору і захавання фіксаваных тэкстаў краязнаўчай тэматыкі значны ўплыў аказваюць наступныя фактары: устойлівае павелічэнне кошту і памяншэнне тыражнасці кніжнай прадукцыі; у большасці выпадкаў эканамічная неканкурэнтаздольнасць падрыхтоўкі краязнаўчых выданняў у параўнанні з іншымі; актыўнае стварэнне і распаўсюджванне розных аналагавых (электронных пераважна) варыянтаў тэкстаў. Бібліятэка ў такіх умовах па сутнасці з'яўляецца тым прадстаўніком дзяржавы, які здольны максімальна поўна сабраць прызначаныя для шырокай чытацкай аўдыторыі фіксаваныя тэксты, захоўваць іх на доўгатэрміновай аснове і арганізаваць актыўнае выкарыстанне. Пры гэтым да ўвагі бярэцца як форма, так і змест тэкстаў. Спалучэнне фармальных і змястоўных характарыстык тэкстаў (калі фармальныя прэвалююць, а змястоўныя другасныя, апасрэдаваныя) дазваляе сабраць і ўлічыць фіксаваныя тэксты як адзінкі гісторыка-культурнага працэсу, ідэнтыфікаваць іх адносіны да вытворчай, навуковай, творчай і іншых відаў дзейнасці ў краіне ці рэгіёне. Змястоўныя характарыстыкі тэкстаў дазваляюць сканцэнтраваць веды, замацаваныя ў іх (незалежна ад формаў фіксавання інфармацыі), і скіраваны не столькі на фізічнае захаванне іх носьбітаў, колькі на кумуляванне і апрацоўку квантаў ведаў аб рэгіёне, краіне, тэрыторыі, народзе, нацыі. У сукупнасці сваёй такія фіксаваныя тэксты ці дакументы ўтвараюць рэгіянальны ўзровень бібліятэчнага фонду нацыянальных дакументаў нашай краіны. На гэтым узроўні на доўгатэрміновай аснове захоўваюцца мэтанакіравана сфарміраваныя фонды (часткі фондаў) дакументаў, створаных на тэрыторыі канкрэтнага рэгіёну (вобласці, раёна, горада і інш.) і/ці звязаных з імі змястоўна. Відавая структура такіх фондаў павінна адлюстроўваць усю разнастайнасць дакументных масіваў з улікам матэрыяльных носьбітаў, якія выкарыстоўваліся, і спосабаў арганізацыі доступу да дакументаў. Па сутнасці гэта рэгіянальны ўзровень канцэнтрацыі нацыянальных дакументаў, які павінен забяспечваць:

– паўнату рэтраспектыўнай і бягучай частак нацыянальнага дакументнага патоку (кніг, газет, часопісаў, нот, карт, выяўленчых выданняў і іншых відаў дакументаў і іх электронных аналагаў),

створаных на тэрыторыі канкрэтнага рэгіёну (вобласці, раёна, горада і інш.);

– інтэграцыю рэгіянальнай часткі сукупнага бібліятэчнага фонду нацыянальных дакументаў у размеркаваны фонд нацыянальных дакументаў, які фарміруецца бібліятэкамі і іншымі сацыяльнымі інстытутамі інфармацыйнай інфраструктуры Рэспублікі Беларусь на нацыянальным узроўні;

– адлюстраванне рэгіянальнай часткі сукупнага бібліятэчнага фонду нацыянальных дакументаў у рэгіянальных пошукавых сістэмах і адзінай (інтэграванай) пошукавай сістэме, у якую ўваходзяць бібліяграфічны, фактаграфічны і паўнатэкставы ўзроўні: электронны інфармацыйны рэсурс нацыянальнай бібліяграфіі Беларусі, нацыянальная электронная бібліятэка Беларусі;

– базу для правядзення краязнаўчых даследаванняў і стварэння па іх выніках адметнай інфармацыйнай прадукцыі.

Інфармацыйна-пошукавыя сістэмы, а таксама разнастайныя адасобленыя ад фонду бібліяграфічныя дапаможнікі (друкаваныя і электронныя выданні бібліяграфічных паказальнікаў, спісаў, аглядаў; базы даных), фактаграфічныя, графічныя, паўнатэкставыя базы даных, якія ствараюцца бібліятэчнымі ўстановамі (у тым ліку і на рэгіянальным узроўні) з’яўляюцца вынікамі бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці ў пэўны гістарычны перыяд. Яны падсумоўваюць асобныя этапы развіцця сістэмы тэкставых (дакументных) камунікацый і адначасова з’яўляюцца элементамі (адзінкамі) нацыянальнай дакументаванай спадчыны. У апошняе дваццацігоддзе прыярытэты аддаюцца развіццю электронных каталогаў і баз даных, якія дазваляюць забяспечыць для карыстальніка аптымальна зручны інфармацыйна-пошукавы рэжым, сабіраць вялікія масівы запісаў, спалучаць у адным рэсурсе бібліяграфічную, фактаграфічную, графічную, аўдыявізуальную і паўнатэкставую інфармацыю і ствараць якасна новыя інфармацыйныя рэсурсы ў параўнанні з «даэлектроннай эпохай». Прычым рабіць гэта можна супольна – намаганнямі шэрагу бібліятэк краіны.

Асноўнай карпаратыўнай пошукавай сістэмай бібліятэк нашай краіны з’яўляецца зводны электронны каталог (ЗЭК) Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (НББ) і дзвюх рэспубліканскіх бібліятэк – Цэнтральнай навуковай бібліятэкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Рэспубліканскай навукова-тэхнічнай бібліятэкі. Ён уведзены

ў доследную эксплуатацыю ў 2010 г. Гэты рэсурс з'яўляецца інфармацыйнай асновай сістэмы карпаратыўнай каталагізацыі (СКК). Распрацаваная праграмна-тэхналагічная платформа СКК разглядаецца спецыялістамі як база для ажыццяўлення далейшай інтэграцыі вядучых бібліятэк рэспубліканскага і абласнога ўзроўняў, а таксама буйнейшых бібліяграфуючых устаноў краіны ў нацыянальную сістэму карпаратыўнай каталагізацыі. На сённяшні дзень у ЗЭК знаходзіцца 3 млн запісаў (1,4 млн бібліяграфічных, 1,6 млн аўтарытэтных запісаў). Працягваецца яго штодзённае папаўненне (звыш 300 новых запісаў). З моманту доследнай эксплуатацыі пачалося выкарыстанне ЗЭК не толькі бібліятэкамі-ўдзельніцамі СКК, але і іншымі ўстановамі і не столькі ў мэтах пошуку інфармацыі, колькі запазычвання запісаў. Зразумела, гэта садзейнічае ліквідацыі ў маштабах рэспублікі дублявання работ па апрацоўцы дакументаў, у тым ліку і краязнаўчага характару. Але ў поўнай ступені прывілеі запазычвання пакуль выкарыстаць немагчыма, таму што за межамі застаецца адна з самых складаных частак бібліяграфічнага запісу – сэнсавая апрацоўка дакументаў. У рэгіянальных бібліятэках Беларусі індэксаванне краязнаўчай літаратуры здзяйсняецца згодна з «Тыпавой схемай класіфікацыі для краязнаўчых каталогаў (картатэк) бібліятэк Рэспублікі Беларусь» (Мінск, 1994), створанай на аснове адпаведных савецкіх правілаў класіфікацыі для каталогаў краязнаўчай літаратуры для абласных, краявых, рэспубліканскіх бібліятэк, а таксама рознымі версіямі бібліятэчна-бібліяграфічнай класіфікацыі (ББК). Вышэй названая схема ўжо не дае магчымасці адлюстроўваць усю шматграннасць краязнаўчага дакументнага патоку, і яе далейшае выкарыстанне патрабуе істотнай дапрацоўкі. Асобныя карэкціроўкі ўносяцца бібліятэкамі лакальна пры апрацоўцы дакументаў. На сучасным этапе стварэння і вядзення карпаратыўных пошукавых сістэм рэгіянальнага і нацыянальнага узроўняў гэта недапушчальна: немагчыма будзе гаварыць аб якасным і сумяшчальным фарміраванні пошукавых вобразаў дакументаў і выкарыстанні класіфікацыйных індэксаў як лексічных адзінак у пошукавых мэтах. Цэнтралізаваная перапрацоўка вышэй названых класіфікацыйных схем немэтазгодна, таму што гэта будзе патрабаваць не толькі значнай навукова-метадычнай работы, асабліва з улікам неабходнасці далейшай пастаяннай падтрымкі, але і ўзгаднення з іх праваўладальнікамі.

Нацыянальная бібліятэка Беларусі і рэспубліканскія бібліятэкі на працягу многіх гадоў выкарыстоўваюць Універсальную дзесятковую класіфікацыю (УДК) для сістэматызацыі дакументаў і арганізацыі тэматычнага пошуку. На думку спецыялістаў, яе магчымасцей дастаткова для сэнсавага адлюстравання ўсіх галіновых кірункаў [2]. Дыяпазон класаў і сістэма агульных і спецыяльных вызначальнікаў УДК дазваляе з дастатковай глыбінёй і дэталёвасцю адлюстраваць змест дакументаў па краязнаўстве (асабліва ў спалучэнні з аўтарытэтнымі загалоўкамі).

На нашу думку, пераход бібліятэк Беларусі (абласных у першую чаргу) на індэксаванне літаратуры сродкамі УДК дазволіць аптымізаваць працэсы бібліяграфавання на ўзроўні краіны, будзе спрыяць якаснаму адлюстраванню зместу краязнаўчых дакументаў у ліку дакументаў іншых галіновых кірункаў. Вынікам такога пераходу стане таксама магчымасць здзяйснення цэнтралізаванага метадычнага і тэхналагічнага кіравання, удзелу ў рабоце міжнароднага супольніцтва. Але найбольш выразна гэта праявіцца ў тэхналогіі фарміравання інфармацыйнай прадукцыі, у тым ліку і пры фарміраванні беларусазнаўчай базы даных «Беларусь: ад мінулага да сучаснага»[1] і рэалізацыі самага буйнога айчыннага бібліяграфічнага праекта – стварэнні электроннага інфармацыйнага рэсурсу (ЭІР) нацыянальнай бібліяграфіі Беларусі.

Трэба сказаць, што на цяперашні час у нашай краіне адсутнічае стройная сістэма крыніц нацыянальнай бібліяграфіі – цэласны бібліяграфічны рэпертуар нацыянальнага дакумента. Разам з тым, зроблены ўсе асноўныя тэарэтычныя напрацоўкі: здзейснена мадэліраванне развіцця нацыянальнай бібліяграфіі Беларусі як гісторыка-культурнай з'явы, паказана спецыфіка ўсіх яе кампанентаў, вызначаны перспектывы рэалізацыі задач нацыянальнага бібліяграфічнага ўліку фіксаванай інфармацыі [1, с. 174–179]. Акрамя таго, Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі пры ўдзеле Нацыянальнай кніжнай палаты (НКП) Беларусі і найбуйнейшых бібліятэк краіны

[1] База даных «Беларусь: ад мінулага да сучаснага» фарміруецца на аснове запісаў электроннага каталога. У ёй адлюстроўваюцца нацыянальныя дакументы (часткі дакументаў) па даволі шырокім пераліку сацыяльна-палітычных і гуманітарных навук. У перспектыве яна можа стаць нацыянальным карпаратыўным рэсурсам з больш шырокім спектрам адлюстравання дакументаў (напрыклад, аналітычны роспіс дакументаў мясцовага друку).

распрацавана «Праграма развіцця нацыянальнай бібліяграфіі Беларусі на 2011–2015 гг. і на перспектыву». Яе асноўныя палажэнні знайшлі адлюстраванне ў Дзяржаўнай праграме «Культура Беларусі» на 2011–2015 гг. у заданні 21 «Стварэнне зводнага электроннага інфармацыйнага рэсурсу нацыянальнай бібліяграфіі Беларусі, уключаючы распрацоўку праграмнага забеспячэння і інфармацыйнага напаўнення». На сённяшні дзень створана першая чарга праграмнага забеспячэння зводнага ЭІР нацыянальнай бібліяграфіі Беларусі, вядзецца работа па пашырэнні яго функцыяналу, здзяйсняецца распрацоўка праграмнага забеспячэння тыпавога рэгіянальнага зводнага электроннага каталога як крыніцы выяўлення і запазычвання запісаў на краязнаўчы блок дакументаў. Наперадзе фарміраванне адзінага масіву бібліяграфічных запісаў, які найперш адлюструе «бібліятэчны блок» нацыянальнай фіксаванай інфармацыі, і ў сувязі з гэтым вырашэнне арганізацыйных, праграмна-тэхналагічных задач, скіраваных на стварэнне сістэмы нацыянальнай бібліяграфіі і яе паспяховага функцыянавання. У перспектыве плануецца аб’яднанне намаганняў усіх арганізацый, што працуюць з нацыянальным дакументам як гісторыка-культурнай з’явай, і ў выніку стварэнне сайта, на якім будуць прадстаўлены:

– масівы бібліяграфічных запісаў, падрыхтаваныя НББ і іншымі бібліятэкамі нашай краіны, а таксама Нацыянальнай кніжнай палатай Беларусі;

– электронныя масівы іншых устаноў нацыянальнага ўзроўню (Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі, навукова-інжынернае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Інстытут прыкладных праграмных сістэм» і інш.), якія забяспечваюць рэгістрацыю, збор, захаванне патэнтаў, справаздач аб навукова-даследчых, вопытна-канструктарскіх, вопытна-тэхналагічных работах і іншых спецвідаў дакументаў, рэгістрацыю баз даных, а таксама іх бібліяграфічнае адлюстраванне.

Гэта дазволіць сабраць бібліяграфічныя звесткі аб усіх нацыянальных дакументах (ад першых рукапісных і старадрукаваных кніг да сучаснай дакументнай прадукцыі розных форм і відаў), даць магчымасць карыстальнікам у аддаленым рэжыме атрымліваць інфармацыю аб іх, а таксама часткова спрасціць заказ і доступ да канкрэтнага экзэмпляра дакумента, а ў перспектыве і да

яго электроннай копіі. У НББ пачалася падрыхтоўка масіваў бібліяграфічных запісаў на нацыянальныя дакументы для інфармацыйнага напаўнення ЭІР нацыянальнай бібліяграфіі Беларусі. Яны фарміруюцца сродкамі аўтаматызаванай бібліятэчна-інфармацыйнай сістэмы НББ. Па зададзеных алгарытмах з электроннага каталога НББ адабраны бібліяграфічныя запісы на нацыянальныя кнігі, брашуры, аўтарэфераты дысертацый, праведзена іх дапрацоўка і сфарміравана асобная калекцыя запісаў пад назвай «Нацыянальная бібліяграфія Беларусі». Яе папаўненне здзяйсняецца ў планавым рэжыме. Акрамя таго, актывізавалася работа па давыяўленні запісаў на нацыянальныя дакументы, якія адсутнічаюць у фондзе НББ. Сфарміравана адпаведная картатэка (больш за 9 тыс. запісаў) для правядзення далейшай даследчай працы і перспектыўнага ўключэння ў зводны ЭІР нацыянальнай бібліяграфіі Беларусі.

Пры гэтым адным са складаных пытанняў з’яўляецца адлюстраванне краязнаўчага блока нацыянальнай дакументнай прадукцыі. Гэта тычыцца выпрацоўкі крытэрыяў выяўлення і адбору краязнаўчых дакументаў для бібліяграфічнага адлюстравання ў ЭІР нацыянальнай бібліяграфіі Беларусі, гарманізацыі падыходаў да каталагізацыі ўсяго спектру нацыянальных дакументаў, выпрацоўкі метадычных рашэнняў па ідэнтыфікацыі ў рэтраспектыўных масівах запісаў на нацыянальныя дакументы, так і да аб’яднання рэтраспектыўных масіваў запісаў. Нельга забываць і пра фактаграфічны блок рэсурсу нацыянальнай бібліяграфіі Беларусі – аўтарытэтныя / нарматыўныя запісы. Нацыянальная бібліятэка Беларусі (пры супрацоўніцтве з іншымі ўдзельнікамі СКК) стварае нацыянальную базу даных аўтарытэтных запісаў, якая непарыўна звязана з электронным каталогам НББ і сучасным зводным электронным каталогам, а ў перспектыве і з ЭІР нацыянальнай бібліяграфіі Беларусі. Вялікі масіў нацыянальных энтытэтаў (імя асобы, назвы калектываў, гандлёвых марак, геаграфічных аб’ектаў і інш.) падрыхтаваны, дапрацоўваецца (дапаўняецца, карэктуецца) ў бягучым рэжыме і актыўна выкарыстоўваецца, у тым ліку і рэгіянальнымі бібліятэкамі. Але для адлюстравання фактаграфічных ведаў краязнаўчага характару яго недастаткова. Неабходна далучэнне да гэтай працы абласных бібліятэк і адпаведна больш глыбокае адлюстраванне аб’ектаў рэгіянальнага ўзроўню і выкарыстанне іх як элементаў пошуку і фарміравання краязнаўчых ведаў.

Рэалізацыя праекта па стварэнні ЭІР нацыянальнай бібліяграфіі Беларусі дазволіць мець арыгінальны нацыянальны інфармацыйны рэсурс, аператыўна ўносіць у яго і ў Нацыянальную базу даных аўтарытэтных запісаў карэктывы, забяспечваць дакладнасць апісання аб’ектаў, комплекснасць прадстаўлення інфармацыі, рэалізоўваць адзіныя метадычныя падыходы да фарміравання бібліяграфічнай і фактаграфічнай інфармацыі нацыянальнага ўзроўню. Гэтыя масівы, па сутнасці, могуць скласці аснову метаінфармацыйнага ўзроўню нацыянальнай электроннай бібліятэкі Беларусі (НЭББ), своеасаблівую базу для ідэнтыфікацыі і пошуку па розных краінах свету нацыянальных фіксаваных тэкстаў.

Ідэі стварэння НЭББ былі закладзены ў пачатку 2000-х гг. пры распрацоўцы праграмы «Памяць Беларусі». Яе здзяйснялі прадстаўнікі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і іншых буйных бібліятэк, музеяў і архіваў краіны. У 2006 г. праект праграмы быў зацверджаны на калегіі Міністэрства культуры і ўзгоднены з шэрагам міністэрстваў і ведамстваў. Аднак у той час статус «дзяржаўнай» праграма не атрымала. Задача па яе рэалізацыі была вызначана асобным заданнем у галіновай праграме «Захаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь на перыяд 2006–2010 гг.». Праект праграмы неаднаразова карэктаваўся. Апошні варыянт быў разлічаны на перыяд 2010–2015 гг., але фінансаванне праграмы не было распачата. На дадзеным этапе патрэба ў стварэнні айчыннай нацыянальнай электроннай бібліятэкі абвастрылася. Накоплены масівы лічбавай інфармацыі, якія маюць непасрэднае дачыненне да Беларусі і могуць быць вызначаны як нацыянальныя. Неабходна паказаць іх у сукупнасці і прадставіць на сучаснай праграмна-тэхналагічнай платформе. З разуменем важнасці гэтай задачы, НББ акцэнтавала ўвагу, найперш прафесійнай супольнасці, на неабходнасць рэалізацыі падобнага праекта і ўносіла прапановы па этапнасці работ, падыходах да вырашэння пытанняў арганізацыйнага характару. У ліку іх аб’яднанне асобных заданняў з трох дзяржаўных праграм[2], скіраваных на стварэнне ЭІР нацыянальнага значэння,

[2] «Дзяржаўная праграма інавацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2007–2010 гады», Дзяржаўная праграма «Культура Беларусі», Падпраграма «Фарміраванне нацыянальнага кантэнту» Нацыянальнай праграмы паскоранага развіцця паслуг у сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій на 2011–2015 гады.

у асобную Дзяржаўную праграму па стварэнні нацыянальнай электроннай бібліятэкі Беларусі. На жаль, такая прапанова не была падтрымана. Разам з тым, у 2012–2013 гг. супрацоўнікамі НББ была распрацавана Канцэпцыя нацыянальнай электроннай бібліятэкі Беларусі, прапанаваны план мерапрыемстваў па яе стварэнні.

Трэба адзначыць, што бібліятэкамі нашай краіны паступова фарміруецца кантэнт для НЭБ Беларусі. Так, НББ з моманту ўводу ў эксплуатацыю новага будынка вядзе планамерную работу па алічбоўцы дакументаў з уласных фондаў. Асобая ўвага надаецца нацыянальным дакументам. У выніку лічбавання сфарміраваны такія электронныя калекцыі, як «Крыніцы па гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст.», «Скарыніяна», «Перыядычны друк Беларусі», «Белавежская пушча»,«Кніга Беларусі XVI–XVIII стст.» і інш. Вядзецца супрацоўніцтва з айчыннымі ўстановамі і арганізацыямі краіны па стварэнні электронных калекцый дысертацый, абароненых у Рэспубліцы Беларусь, электроннага архіва цэнтральных і вядучых рэспубліканскіх грамадска-палітычных газет, часопісаў і паведамленняў інфармацыйных агенцтваў. Паралельна з алічбоўкай ўласнага фонду НББ супрацоўнічае з айчыннымі і замежнымі бібліятэкамі і архівамі па выяўленні і запазычанні нацыянальных дакументаў у электронным выглядзе, абмене электроннымі аналагамі дакументаў. Здзяйсняецца таксама лічбаванне дакументаў і па заказах асобных арганізацый, найчасцей рэгіянальных бібліятэк, якія не маюць адпаведнай камп'ютарнай тэхнікі. Гэта можна лічыць добрым унёскам у фарміраванне краязнаўчых паўнатэкставых калекцый. На сённяшнім этапе яны найбольш актыўна ствараюцца ў Віцебскай і Гомельскай абласных універсальных бібліятэках.

Відавочна, што намаганнямі асобных арганізацый на існуючай матэрыяльна-тэхнічнай базе стварыць нацыянальную электронную бібліятэку немагчыма. Неабходна прыняцце цэлага комплексу мер па пераводзе ў лічбавы фармат нацыянальнага дакументнага фонду краіны і стварэнне размеркаванай інфармацыйнай сістэмы, здольнай аб'яднаць лічбавыя рэсурсы бібліятэк. Якаснае і аператыўнае фарміраванне кантэнту НЭБ Беларусі, яго эфектыўнае выкарыстанне можа забяспечыць аптымальная арганізацыйная структура, у якой мэтазгодна вылучыць два тыпы ўдзельнікаў: базавая арганізацыя і арганізацыі-партнёры. На базавую арганізацыю (ёй

можа быць НББ) ускладаюцца функцыі кіравання кантэнтам НЭБ Беларусі, размеркаванне адказнасці / паўнамоцтваў па яго фарміраванні з партнёрамі, арганізацыя работ па падрыхтоўцы нарматыўнай дакументацыі і метадычных рэкамендацый, якія забяспечаць узаемадзеянне ўдзельнікаў НЭБ Беларусі пры фарміраванні метаінфармацыі, стварэнні лічбавых копій, выкананні неабходных стандартаў, пратаколаў, правілаў, а таксама выкананне замацаванай за ёй адказнасці па інфармацыйным напаўненні кантэнту НЭБ Беларусі. Арганізацыі-партнёры (абласныя бібліятэкі як апорныя ў рэгіёнах) павінны забяспечваць фарміраванне пэўнага краязнаўчага блоку кантэнту НЭБ Беларусі ў рамках сваёй кампетэнцыі, а таксама арганізацыю і забеспячэнне свабоднага доступу да ўласнага (лакальнага ў адносінах да НЭБ Беларусі) фонду электронных дакументаў (электроннай бібліятэкі). У працэсе стварэння і функцыянавання НЭБ Беларусі базавая арганізацыя і арганізацыі-партнёры павінны забяспечыць уніфікацыю прадастаўлення метададзеных, сумяшчальнасць фарматаў прадстаўлення дадзеных, інтэрфейсаў пошуку, слоўнікаў, пратаколаў, схем і інш. Ключавы прынцып структуры НЭБ Беларусі як сістэмы – самастойнае развіццё электронных бібліятэк арганізацый-партнёраў з адначасовай інтэграцыяй іх дадзеных у адзіную інфармацыйную прастору НЭБ Беларусі.

Стварэнне айчыннымі бібліятэкамі краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў як неад’емнай складаючай ЭІР нацыянальнай бібліяграфіі Беларусі і НЭБ Беларусі будзе садзейнічаць фарміраванню адзінай інфармацыйнай прасторы краіны, яе інтэграцыі ў сусветную інфармацыйную інфраструктуру і спрыяць забеспячэнню інфармацыйнай роўнасці жыхароў усіх рэгіёнаў. Паспяховае развіццё вышэй разгледжаных (самых маштабных інфармацыйных праектаў), безумоўна, умацуе пазіцыі нашай дзяржавы на сусветным рынку інфармацыйных прадуктаў і паслуг.

## ЛІТАРАТУРА

1. **Кузьминич, Т. В.** Динамическая модель национальной библиографии Беларуси / Т. В. Кузьминич, О. В. Лихимович, Е. И. Косинская ; ГУ «Национальная библиотека Беларуси». – Минск., 2012. – 181 с.

2. **Пугачева, С. А.** Смысловая обработка документов в библиотеках Беларуси: особенности и перспективы применения УДК // Бібліятэчны свет. – 2013. – № 4. – С. 4–6.